**Здановіч Н.І. (Мінск)**

## Максім Багдановіч: глыбіня спасціжэння культурных традыцый

«Па глыбіні пранікнення ў духоўную спадчыну стагоддзяў з Багдановічам маглі параўнацца нямногія» [2, с. 103]. Гэтыя словы, сказаныя Н. Гілевічам на вечарыне, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння паэта, тлумачаць феномен Багдановіча-творцы, прычыну ўвядзення яго ў шэрагі не толькі класікаў беларускай літаратуры, але і даследчыкаў нашай культуры. Аб’ектамі творчасці паэт заўсёды выбіраў не выпадковыя, а самыя значныя артэфакты нацыянальнай культуры.

Ці выпадкова з’явіўся вобраз васілька, названага паэтам «цвятком радзімы»? У традыцыйным дэкаратыўным мастацтве васілёк-валошка вядомы па выявах на кафлі яшчэ з сярэдзіны XVII ст. Найбольш гэты матыў пашыраецца менавіта на ранейшых крывіцкіх землях – у Полацку [4, мал. 7, 9], Друі і Віцебску [5, мал. 17], а таксама на іх памежжы [3, мал. 22]. У распаўсюджанай кампазіцыі «букет у вазе» ён замяняе звыклы і вельмі папулярны ў тагачаснай Еўропе цюльпан. Распаўсюджаны ў кафлярстве і, верагодна, у цесна звязаным з ім разьбярстве матыў валошкі «перабраўся» і ў ткацтва. Ён замацаваўся ў слуцкіх паясах, стаўшы элементам не толькі традыцыйнай, але і элітарнай культуры.

Слуцкія паясы М. Багдановіч пабачыў у рэдакцыі «Нашай нівы», дзе В. Ластоўскі і браты Луцкевічы разгарнулі сваю асаблівую музейную экспазіцыю са шматлікіх артэфактаў нашай гісторыі і культуры. У сценах рэдакцыі вiравала адраджэнскае жыццё. Практычна кожны, хто ў 1911–1912 гг. заходзіў туды, бачыў экспанаты і захапляўся нашай мінуўшчынай. Але што мы ведаем пра тую экспазіцыю? Засталося толькі некалькі ўсхваляваных радкоў з успамінаў З. Бядулі. Геній жа М. Багдановіча выхапіў з экспанатаў самы важны – слуцкія паясы. Адным вершам («Слуцкія ткачыхі») паяднаўшы народную і шляхецкую культуры, знітаваўшы іх у адзінае рэчышча беларускай, ён вярнуў нам гістарычную памяць і назаўсёды зрабіў слуцкія паясы артэфактам нацыянальнай культуры ў вачах сусвету.

Другі верш М. Багдановіча, які стаў культавым творам беларускай культуры, – «Пагоня». Паўтараецца тая ж заканамернасць: усе «нашаніўцы» праходзілі праз Вострую Браму, над якой знаходзіўся старажытны герб, але толькі М. Багдановіч зразумеў яго сімвалічнае значэнне для тагачаснага Адраджэння.

Выява збройнага вершніка зафіксавана яшчэ на вялікакняскай пячатцы князя Вітаўта [8, с. 43]. Асабліва папулярнымі варыянты выяваў вершніка на пячатках сталі з XVI ст.: імі карысталіся як асобныя роды (слуцкія Алелькавічы) [7, с. 45, 86–87], так і паветы, ваяводствы [8, с. 46–49], гарады нават у часы Расійскай імперыі [6, с.109, 133, 136]. У XVI ст. такая ж выява выкарыстоўвалася пры вырабе заказной кафлі, прыкладам, у Полацку [4, мал. 12:1]. Паэт рэанімаваў нашу гістарычную памяць, пацвердзіў права беларусаў на гістарычны сімвал, адначасова акрэсліўшы праблему страты гэтай памяці часткай грамадства.

Паэтычнае натхненне прыйшло да М. Багдановіча ля касцёла Св. Ганны ў Вільні. Ён не толькі спасціг, але і перадаў сімвалічны сэнс гатычнага храма і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гатычнай эпохі, якая клікала чалавека ад зямных турбот і нягод «на блакітны шлях».

У гэтым рэчышчы цалкам зразумелае захапленне паэта яшчэ адным архітэктурным збудаваннем Беларусі – Чырвоным касцёлам у Мінску. З успамінаў Зоські Верас вядома, што па дарозе на працу Максім кожны дзень затрымліваўся каля «новага касцёла», і яго літаральна «няможна было адарваць, да таго быў захоплены» [9, с. 110]. Чаму не вабілі яго старажытныя касцёлы і цэрквы на Верхнім горадзе, паўз якія праходзіў М. Багдановіч на шляху ў бібліятэку імя Пушкіна? Стаялі ж тады яшчэ не толькі езуіцкі і былы бернардынскі касцёлы, але і царква Святога Духа, і велічны дамініканскі касцёл! Магчыма, чырвоныя муры касцёла Св. Сымона і Алены нагадвалі яму Св. Ганну і Вільню, а можа, ён інтуітыўна адчуваў тое, што змаглі перадаць архітэктары – паліхромную радасць сапраўднай беларускай готыкі, што ён бачыў у Вільні. І можна не сумнявацца: калі б не пагаршэнне стану здароўя паэта і не хуткі ад’езд, на свет нарадзіўся б яшчэ адзін гімн храму. За М. Багдановіча яго напісаў Л. Пранчак.

Дзіўная рэч: М. Багдановіч жыў толькі ў вялікіх гарадах: Мінск, Гродна, Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль. Аднак урбаністычнай яго паэзію не назавеш. Вершы пра Вільню – гэта, хутчэй, погляд збоку на тлум і неўпарадкаванасць гарадскога жыцця. У гэтым ён як творца таксама адпавядае традыцыям беларускай літаратуры і выяўленчага мастацтва, дзе на першым плане – прырода і вясковыя пейзажы, а горад узнікае пераважна ў звязку са старажытнымі пабудовамі. І паэтавы прыярытэты асабліва добра бачныя ў заключных радках верша «Эміграцкая песня»: «І на вулцы пад грукат, пад гоман, / Дзе натоўп закруціўся рухавы, / Мне маячыцца вёсачка, Нёман / І агні партавыя Лібавы» [1, с. 272]. Згадванне Нёмана невыпадковае. Пра гэту раку гаворыць М. Багдановіч не толькі таму, што некалі жыў ля яе ў Гродна. Гэта зноў – паэтава геніяльная здольнасць беспамылкова выбіраць галоўнае сярод мноства варыянтаў: менавіта Нёман стаўся самай папулярнай ракой для нашых пісьменнікаў XIX і XX стст. (А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Э. Ажэшкі, Я. Коласа, Д. Бічэль-Загнетавай, А. Астрэйкі і інш.) – выбар М. Багдановіча аказаўся тыповым для беларусаў.

І яшчэ ў адным М. Багдановіч выявіўся як паэт, які спасцігнуў глыбінныя вытокі нашых традыцый і нашай спадчыны: ён вывучаў і выкарыстоўваў беларускі фальклор, разумеючы яго значэнне для спасціжэння душы народа. Разам з народам яму хацелася жыць, хацелася памерці сярод сваіх… Паміраць на чужыне, у адзіноце, як тое здарылася з Максімам, – гэта лёс нашых Праракаў, гэта таксама вельмі па-беларуску.

Лёс адпусціў М. Багдановічу мала зямнога часу, але кампенсаваў гэта здольнасцю да беспамылковага выбару самага важнага. Яго спадчына – гэта шэраг важнейшых артэфактаў і сімвалаў нашай культуры, якія маркіруюць яе ў сусвеце.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Бачыла, А. Дарогамі Максіма Багдановіча. – 2-е выд., перапрац. і дап. / А. Бачыла. – Мінск, 1983.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Заяц, Ю.А. Заслаўская кафля / Ю.А. Заяц. – Мінск, 1990.
4. Здановіч, Н.І. Кафлярства ў Беларусі (на матэрыяле калекцыі Полацкай кафлі) : метад. дапам. / Н.І. Здановіч. – Мінск, 2005.
5. Левко, О.Н. Витебские изразцы XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1981.
6. Цітоў, А. Гарадская геральдыка Беларусі / А. Цітоў. – Мінск, 1989.
7. Цітоў, А. Пячаткі старажытнай Беларусі / А. Цітоў. – Мінск, 1993.
8. Цітоў, А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі / А. Цітоў. – Мінск, 1999.
9. Шлях паэта : успаміны і біяграфічныя матэрыялы пра Максіма Багдановіча. (З. Верас. Пяць месяцаў у Мінску). – Мінск, 1975.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ